культурныя прадметы – замок і ключ: *"Я сваю скаціну загаварую, засцерагаю... зялезным тынам загароджую, зялезнымі замкамі зубы, ляпы ім замыкаю, на сіня мора залатыя ключы закідаю"* (75, 157).

Дыктат прыроднага круга заўважаецца ў прыёме дынамічнага згортвання мастацкай прасторы да асобнага двара з прастолам як яго цэнтрам, а прастол, як і ў паляўнічых замовах, заўсёды звязаны з сакральнымі персанажамі: *"Адкуль сонца ўсходзіць, з той стараны месяц усходзіць, з той стараны Божа мацер на мой двор прыходзіць. На Наталліным двары прастол стаіць, за прастолам Божа мацер сядзіць..."* (56, 93). Новы матыў у жывёлагадоўчых замовах – размыканне круга для сустрэчы апекуноў: *"Мы ўсе вароты адчыняем, Госпада Бога прымаем. Выйдзі, Гасподзь, з неба, як ты нам трэба. Сам не зайдзеш, то нам дзвенаццаць янгелаў адпраўляй"* (59, 102). Светланоснасць хрысціянскіх персанажаў – тая вызначальная рыса, якая дазволіла вельмі лёгка ўвесці іх у жывёлагадоўчыя замовы нароўні з першаснымі вобразамі нябесных свяціл.

Расейскі даследчык **Юрый Сцяпанаў** вельмі дакладна адзначыў, што "ў культуры няма ні чыста матэрыяльных, ні чыста духоўных існасцяў: тыя і другія ідуць парамі"[18]. Так і ў жывёлагадоўчай магіі засцерагальны круг атрымлівае вербальнае і невербальнае ўвасабленне. Яго стварэнне – ядро абраду, што меў на мэце прадухіліць эпізаотыю*. Звычайнымі выканаўцамі былі нявінныя дзяўчаты і ўдовы, якія ўпрагаліся ў плуг і ўзворвалі баразну вакол вёскі, магічным шляхам абараняючы жывёлу ад пошасці. А ў замове ахоўны круг ад акружнасці, маркіраванай канцэптам "бор", да цэнтра (падвор'е, дзе знаходзіцца карова) узорваюць боскія апекуны чалавека і яго гаспадаркі. Яны ператвараюць чыстае поле ў акультураную прастору, непераадольную для дэманічных сіл: *"Прарока Ілля спорныя Іваны белымі канямі яго ад бора аралі, і пахалі, і гарохам засявалі, штоб змяя не пралясцела, ніхто ні прайшоў, ні праехаў..."* (58, 97). Відавочна, што *"спорныя Іваны"*, *"белыя коні"*, ворыва, *"гарох"* – метафарычны малюнак навальніцы ў тэрмінах культурных рэаліяў, што яшчэ раз упэўнівае ў генетычнай першаснасці прыродных узораў.

* **Эпізаотыя** – пашырэнне інфекцыйнай хваробы жывёл на значнай тэрыторыі. – *Заўвага рэд.*

Такім чынам, параўнальны аналіз паляўнічых і жывёлагадоўчых замоў дае унікальную магчымасць прасачыць нелінейную дынаміку мастацкага ўвасаблення прыроднай па сваёй сутнасці мадэлі, якой з'яўляецца круг, у рознастадыяльных магічных тэкстах.

[1] **Степанов Ю.** В мире семиотики // Семиотика: Антология. – Москва, 2001. С. 28.
[2] Гл.: **Мифы народов мира:** Энциклопедия: В 2 т. Т. 2. – Москва, 1992. С. 100.
[3] Гл.: **Пелипенко А., Яковенко И.** Культура как система. – Москва, 1998. С. 21.
[4] **Тамсама.**
[5] **Замовы** / Уклад., сіст. тэкстаў, уступ. арт. і камент. Г. Барташэвіч. – Мінск, 2000 (Беларуская народная творчасць). С. 33, № 2. Далей спасылкі на гэтае выданне падаюцца ў дужках з пазначэннем старонкі і нумара замовы.
[6] Гл.: **Топоров В.** К происхождению некоторых поэтических символов (Палеолитическая эпоха) // Ранние формы искусства. – Москва, 1972. С. 83.
[7] **Тамсама.** С. 82.
[8] Гл.: **Столяр А.** О генезисе изобразительной деятельности и ее роли в становлении сознания (К постановке проблемы) // Ранние формы искусства. – Москва, 1972. С. 47 – 54.
[9] **Тамсама.** С. 38.
[10] Гл.: **Замятнин С.** Очерки по палеолиту. – Москва – Ленинград, 1961.
[11] **Топоров В.** К происхождению некоторых поэтических символов. С. 86.
[12] **Тамсама.** С. 85.
[13] **Элиаде М.** Миф о вечном возвращении. – Москва, 2000. С. 150.
[14] **Генон Р.** Символы священной науки. – Москва, 2002. С. 238.
[15] **Стихи духовные.** – Москва, 1991 С. 34 – 35.
[16] **Фрейденберг О.** Миф и литература древности. – Москва, 1978. С. 17.
[17] **Пелипенко А., Яковенко И.** Культура как система. С. 48.
[18] **Степанов Ю.** Семиотика концептов // Семиотика: Антология. – Москва, 2001. С. 604.

*Культура продкаў*

Валерый БОЛБАС,
Іна СЫЧОВА

# ВЫХАВАЎЧАЯ І СТВАРАЛЬНАЯ СІЛА НАРОДНЫХ ЗАМОЎ

У розных народаў ёсць тая сфера духоўнай дзейнасці, у якой яны найбольш поўна самавыяўляюцца. Але ўсе людзі ў старажытнасці не абыходзіліся без танца, песні, мелодыі. Асаблівасць светаўспрымання беларусаў – у дакладным адчуванні слова, цеснай сувязі з роднай мовай. Пры неспрыяльных сацыяльных умовах пісьмовая фальклорная традыцыя найперш выявілася ў сінкрэтычнай літаратурнай творчасці айчынных мысляроў. Пісьмовая традыцыя складалася таксама з філасофскіх і педагагічных канцэпцый, у нечым апярэдзіла свой час. Вусная традыцыя спарадзіла найбагацейшы сярод славянскіх народаў фальклор – бяздонны калодзеж мудрасці, глыбіню якога мы не можам спасцігнуць і сёння.

**Замовы** лічацца адным з самых старажытных жанраў вуснай народнай творчасці. Па часе стварэння іх суадносяць з узнікненнем наскальнага жывапісу. Яны ўвабралі ў сябе і эстэтычную творчасць, і маральныя традыцыі народа. Такім чынам, замовы – важная частка ментальнага кода беларусаў. Словы ў гэтым фальклорным жанры мае незвычайную сілу, здольнасць уздзейнічаць на фізічную і маральную прыроду чалавека, яго думкі і паводзіны, адносіны да прыроды. На Беларусі хрысціянства і язычніцтва

ўтварылі сінтэз, даволі нечакана спалучаліся ў светапоглядзе, выхаванні, дзейнасці беларусаў.

Нягледзячы на сакральнасць і абмежаванае выкарыстанне, замовы і сёння папулярныя ў народзе. Міфалагічная свядомасць, якая складвалася на працягу тысячагоддзяў, па-ранейшаму існуе на ўзроўні падсвядомасці і ўплывае на фармаванне жыццёвых ідэалаў, маралі, вызначае многія нашы ўчынкі і паводзіны. Этнапсіхолагі заўважылі, што беларусы ў старажытнасці ахвотна верылі ў прымхі, забабоны, часта кіраваліся прыкметамі і павер'ямі. Пэўную містычнасць такога светапогляду можна растлумачыць тым, што нашым продкам быў уласцівы ўсходні тып культуры, абумоўлены пераважным развіццём правага паўшар'я мозга, якое "адказвае" за вобразнае мысленне, рэлігійныя перажыванні і мае цэнтр гіпнозу [1, 161]. Гэтыя ўласцівасці захаваліся ў менталітэце народа, але ў належнай ступені не ўлічваліся пры арганізацыі выхаваўчага працэсу. Падыходы да чалавека, адзначаныя ў замовах, не састарэлі, спосабы ўздзеяння на псіхіку не страцілі свайго значэння. Жанр замовы і адносіны да яго варта ўспрымаць не як перажытак мінулага, а як частку нацыянальнай культуры і ўлічваць пры вызначэнні кірункаў маральнага і эстэтычнага выхавання. Слова, на думку сучасных навукоўцаў, мае велізарны энергетычны патэнцыял і з'яўляецца найважнейшым у выхаваўчай справе.

## ЗАМОВЫ І ПЕДАГОГІКА

Беларускія замовы ўяўляюць з сябе язычніцкія малітвы за здароўе і псіхалагічную раўнавагу асобнага чалавека. У народнай педагогіцы фізічнае здароўе, душэўная раўнавага ва ўсе часы ўспрымаліся як падмурак выхавання гарманічнага чалавека: працавітага, высокамаральнага, здольнага пераадольваць жыццёвыя цяжкасці, адстойваць інтарэсы сям'і і роду. Пытанням выхавання надавалася належная ўвага, нездарма значная частка замоў была скіравана на маці і дзяцей. Яны прамаўляліся ў час цяжарнасці, родаў, а пазней непасрэдна пры лячэнні і для папярэджвання дзіцячых хваробаў ("Ад пярэпалаху", "На здароўе дзіцяці", "Малым дзецям на спанне і прыбыванне").

Своечасовае харчаванне, спакой, здаровы сон – надзейныя сродкі прафілактыкі і загартоўкі ў раннім узросце. Асабліва важным лічыўся сон, яму надавалася вялікае значэнне. Відавочна, гэта звязана са старажытнымі ўяўленнямі пра тое, што ў час сну душа пакідае цела і ў яго можа трапіць хвароба ці ліхі дух. Невыпадкова да нашага часу захаваліся забароны класці дзяцей спаць на захадзе сонца, рэзка будзіць іх, дазваляць незнаёмым людзям глядзець на дзяцей, якія спяць. Існавалі нават адмысловыя рытуалы. Напрыклад, калі дзіця клалі спаць, пажадана было казаць наступнае: "*Я цябе, маё дзіцятка, спаць лажу, крыжам абгараджу. Ангелы па баках, а Прачыста Божа Маці ў галавах. Прачыста Божа Матка, беражы майго дзіцятка з вечара да ночы, а з ночы да свету і да ўсяго веку*". Аптымістычны эмацыйны настрой замовы перадаваўся і маці, і дзіцяці.

Ва ўяўленнях беларусаў асабліва небяспечнымі для спакойнага сну немаўлятаў былі злыя духі ночы – Начніцы, Крыксы, Плаксы. Паводле старажытных паданняў, "катора кабета ніколі не мела дзіцяці праз сваё шэльмоўства, або яе людзі праклялі, то такая па смерці ходзіць Начніцаю: не дае дзецям спаць, шчыпле іх, дакучае, а дзіця ўсё плача ўсю ноч" [2, 184]. Надзейнымі сродкамі пазбаўлення ад Начніцаў лічыліся замовы, дзённае святло, хатняе вогнішча, адорванне начных духаў хлебам-соллю, якія клалі на вакно. Тут адначасова выяўляліся і ўвага да фізічнага і псіхалагічнага стану немаўлятаў, і спроба ўздзейнічаць на іх з дапамогай магічнага слова, а таксама строгія крытэрыі маральнай ацэнкі паводзінаў жанчыны. Увогуле, пазбаўленне здольнасці мець дзяцей, гадаваць іх лічылася продкамі найвялікшым пакараннем для жанчыны за амаральныя паводзіны, ад якога няма паратунку нават пасля смерці.

Многія замовы і прыкметы былі скіраваныя на тое, каб зберагчы малых дзяцей ад непажаданых сустрэч, ад злога слова ці нядобрых вачэй. У старажытнай народнай педагогіцы кантакты паміж дзецьмі ва ўзросце да года забараняліся, бо лічылася, што "мацнейшае дзіця пераможа слабейшае і апошняе захварэе" [3, 561]. Калі сустрэча ўсё ж адбывалася, то дзецям трэба было пацалавацца, але сачылі, каб адно не падымалі вышэй за другое. Гэтаму надавалася значэнне перашкоды да распаўсюджвання інфекцыйных захворванняў, перасцярогі ад мітуслівасці, паспешлівасці неапраўданага імкнення паскорыць тэмпы псіхафізічнага развіцця дзяцей. Старажытная народная педагогіка, прытрымліваючыся прынцыпу "не нашкодзіць", не спяшалася выводзіць дзіця за парог роднага дома, пакуль не быў вы-



*Іна Сяргееўна Сычова – спашукальнік кафедры педагогікі Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Н. К. Крупскай. Закончыла філалагічны факультэт гэтай навучальнай установы (1987).*

*Валерый Сяргеевіч Болбас – даследчык гісторыі педагогікі і народнай педагогікі Беларусі. Кандыдат педагагічных навук (1993). Закончыў механіка-матэматычны факультэт Гомельскга дзяржаўнага універсітэта (1970). Працаваў настаўнікам, дырэктарам школ Акцябрскага раёна Гомельскай вобласці. З 1995 г. працуе ў Мазырскім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Н К. Крупскай. Дацэнт, загадчык кафедры педагогікі (1996), прарэктар па навучальнай працы (2000). Аўтар манаграфіі "Ідэі маральнага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі эпохі Адраджэння" (1998).*



працаваны фізічны, псіхалагічны і маральны імунітэт.

Нашы продкі добра ўсведамлялі сілу слова. Невыпадкова існавалі замовы нават "Ад прымавак". Прыказка – гэта перліна народнай мудрасці і філасофіі, гэта не проста выказванне, а вывераная жыццём і часам думка. Але сказаная не ў пару, не ў добры час, яна можа незнарок прынесці шкоду чалавеку. Прымаўкі, замовы, дзіцячыя забаўлянкі і казкі раней складалі суцэльны пласт народнай культуры і адначасова, як лічылася, выконвалі ахоўныя функцыі. У іх часта сустракаюцца "сарокі-вароны", якія ўмеюць не толькі кашу варыць, але і адганяць сурокі, прыстрэкі. Гэта сведчыць пра знітаванасць розных фальклорных жанраў, іх комплекснае ўздзеянне на юнага слухача. Асаблівая ўвага ў старажытнасці надавалася перасцярозе і лячэнню ад сурокаў, прыстрэкаў, прыгавораў, падзіваў. Па ўяўленнях даўніны, здольнасці сурочыць мелі і мужчыны, і жанчыны, і дзеці. У фальклоры сустракаюцца сурокі ветравыя, віхравыя, "з прыгавору, з падзіву, з напраснага слова" [3, 270]. Галоўныя сродкі іх лячэння – замовы, у якіх шырока выкарыстоўваліся ўласцівасці вады і агню. Важнае значэнне набываў час (ліхая альбо добрая гадзіна) і слова (*"Першым разам, божым часам, Бог з памаччу, а я са словам!"*) [3, 56]. У старажытнай народнай педагогіцы вусным метадам надавалася вялікае значэнне ў выхаванні чалавека, уздзеянні на яго духоўна-эмацыйны свет. Сучасныя педагогі сталі пераемнікамі гэтых традыцый, але адносіны да слова змяніліся, нівеляваліся, што адмоўна адбілася на сістэме выхавання і маральным стане грамадства.

Магія, веданне замоў у старажытнасці – нароўні з прадзеннем, ткацтвам, вышываннем – лічыліся спрадвечнымі жаночымі справамі. У замовах часта сустракаецца вобраз трох сясцёр, якія сядзяць пад дубам: *"адна шыла, другая пашывала, а трэцяя ўрокі, улёкі спугі, пярэпалахі вымала"* [3, 266]. Народная педагогіка і магія маюць шмат сродкаў для барацьбы з дзіцячымі страхамі, спудам. Гэтай далікатнай праблеме надавалася належная ўвага, дзецям розных узростаў аказвалася маральна-псіхалагічная падтрымка. Асабліва плаксівым, з кепскім здароўем "шапталі ляк", "выкочвалі" яго сырым яйкам, выконвалі магічныя дзеянні з агнём і вадой. Раней думалі, што з перапуду можна сур'ёзна захварэць альбо магло здарыцца "парушэнне душы" – адхіленне псіхічнага характару. У замовах так маляваўся вобраз пачвары-ляка: *"У ляка васковая галава, трухлявае цела, канапляныя ногі. Васковая галава растопіцца, трухлявае цела рассыплецца, канапляныя ногі паломяцца"* [3, 321]. Калі сёння ўлічыць папулярнасць замежных мультсерыялаў пра прывідаў і кішэнных монстраў – пакемонаў, то народныя ўяўленні беларусаў пра дзіцячыя страхі можна з поспехам выкарыстоўваць у нацыянальнай мультыплікацыі, пры арганізацыі выхаваўчай работы з дашкольнікамі і малодшымі школьнікамі.

У замовах ажывалі персанажы беларускай міфалогіі: Лясун, Дамавік, Падвей, Мара, іншыя ліхія і добрыя духі. Менавіта дзеці найбольш верылі ў іх існаванне, адчувалі страх цемры, адзіноты, страхі ў сне. У народнай міфалогіі багіня ночы Мара насылае нядобрыя сны і нават душыць у сне. І ў наш час існуе выраз "адкасніся, Мара", адрасаваны надакучліваму чалавеку. Пазбавіцца кепскіх сноў дапамагалі замовы "На добры сон", "На збаўленне ад нуды" і інш. Вера ў злых духаў мела і перасцерагальнае выхаваўчае значэнне. Для фармавання адпаведных маральных якасцяў, карэкціроўкі паводзінаў ужываўся метад застрашвання. Дзяцей палохалі Дамавіком, Хлеўнікам, Вадзянікам, духам агню Жыжалем дзеля таго, каб яны не нарабілі шкоды, не лезлі без патрэбы ў ваду ці ў агонь. Але дзеці былі не толькі аб'ектам выхавання і ўздзеяння народнай магіі. Яны самі ўдзельнічалі ў абрадах, даведваліся пра спосабы лячэння, вучыліся жыць у згодзе з прыродай. Так, існавала перакананне, што менавіта дзеці паспяхова замаўляюць "грызь", хваробы спіны. Лічылася, найлепш дапамагаюць замовы ад таго, хто першы нарадзіўся ў сям'і.

Прырода таксама была часткай народнага светаўспрымання і педагагічных традыцый. Знахары звярталіся да яе па дапамогу: да паноў "лесавога, баравога, палявога, лугавога", "пані маці маланкі-бліскухі", "вадзіцы-царыцы зямной і нябеснай" і духу ветру – усемагутнага Падвея. Жанр замовы, як і іншыя жанры фальклору, сведчаць, што лес, навакольная прырода мелі значны ўплыў на выхаванне дзяцей, якія змалку збіралі грыбы і ягады, прывучаліся да традыцыйных рамёстваў, пасвілі жывёлу. Вядома цікавая замова "Ад лесуна": *"Цар лесавы, царыца-лесавіца! Прымі ты наш падарак і нізкі паклон, і прымі ты маіх рабят і адпусьці іх дамоў"* [3, 44]. Традыцыйны ўклад жыцця адлюстраваны ў бортніцкіх, рыбалоўных, паляўнічых замовах. Замова гаспадарчага характару "Для пчол" звернута да маладога рою і гучыць як наказ-павучанне: *"...параней уставайце, сваіх дзетак пабуджайце і пасылайце іх у цёплыя лясы, у шчырыя бары. <...> Да чужых пчол не лятайце і чужых да сябе не пускайце. Як маці зямлі, свайго месца пільнуйцеся"*, а таксама *"чужога не бяры і свайго не кідай"* [3, 36]. Старажытны чалавек не аддзяляў сябе ад прыроды, пераносіў на навакольныя з'явы свае паводзіны і перажыванні, таму гэтыя думкі можна адрасаваць і моладзі. Эпітэты і паняцці, якія ўжываліся ў замове (шчыры бор, маці-зямля і інш.), – вызначальныя для народнага светаўспрымання.

## ЗАМОВЫ І КАХАННЕ

Замовы, павер'і, шматлікія магічныя дзеянні раней суправаджалі чалавека ад нараджэння да смерці, з'яўляліся часткай звычаёвых правілаў, традыцыйнага ўкладу жыцця і выхавання. Многія замовы ў беларускім фальклоры прысвечаны каханню. Гэтае пачуццё ўзмацняе індывідуальны, творчы пачатак і прымушае інтэнсіўна засвойваць грамадскія нормы і каштоўнасці, шукаць маральную падтрымку ў народнай мудрасці, часткай якой па праву лічацца замовы. Каханне – пачуццё, якому ў жанры замовы надаецца не меншая ўвага, чым цялесным хваробам. Каханне мае над чалавекам неабмежаваную ўладу, паводле замовы, сушыць *"сушэй саламіны"* [3, 373], не дае магчымасці *"ні ў чыстым полі нагуляцца, ні ў парной бані парыцца, ні прэсным малаком нахлябацца, ні ў мяхкай пасьцелі атаспацца"* [3, 371]. Паводле беларускіх замоў, якія таксама мелі назвы *"прысмуты"*, *"прысушкі"*, *"любжы"*, каханне – гэта шчымлівы боль, *"нуда"*, *"сухата"*, *"таска кіпучая, гаручая, магучая"* [3, 373]. Яна нават надзяляецца ўласцівасцямі жывой істоты, мае падабенства з

міфалагічнымі персанажамі: *"Плача таска, рыдае, белага свету дажыдае, радуецца і весяліцца"* [3, 373]. У розных варыянтах яно (каханне) *"схавана за морам, пад камнем, пад дошкай"*, аддзеленае ад чалавека і таму не падуладнае яму, а падпарадкоўваецца толькі найвышэйшым сілам і сіле слова. Магічны і эстэтычны сэнс нясуць вобразы сонца і месяца, трох зарніц ці зорачак, што маюць сімвалічныя назвы: *"адна прывара, друга прынуда, трэйця прысуша"* [3, 377]. Сіла пачуцця параўноўваецца з жарам *"трыдзевяці кастроў дубовых дроў"* [3, 371] або *"трох печак – меднай, жалезнай, кірпічнай"* [3, 370]. Каханне надзяляецца пераўтваральнай, жыццядайнай сілай агню – праобраза сонца, – які меў выключна важнае значэнне ва ўсіх абрадах. Асноўны сюжэт замоў-прысушак нярэдка разгортваецца каля дуба – свяшчэннага дрэва, на месцы старажытных ахвярапрынашэнняў.

У замовах на ўзаемнае каханне часцей звяртаюцца не да хрысціянскіх святых, а да ведзьмаў і ведзьмароў, "акаяннай сілы". Узгадваюцца таксама ***воўк, "змяя-самаверніца", воран***. Магчыма, тут адлюстраваўся погляд народнай маралі на няшчаснае каханне як на праклянцце, хваробу, насланнё злых сілаў (назіраецца канфлікт хрысціянскай і язычніцкай традыцый, якія мелі адрозненні ў трактоўцы ўзаемаадносінаў палоў). Напрыклад, этнографы адзначаюць, што ў старажытнасці ў час Купалля дапускаліся і нават заахвочваліся вольныя адносіны паміж мужчынамі і жанчынамі. Гэта не лічылася амаральным, бо было часткай абрадаў, скіраваных на павышэнне ўрадлівасці зямлі і пладавітасці жывёлы, што ставіліся ў цесную залежнасць ад дзейнасці чалавека (маюцца на ўвазе часы шанавання бога ўрадлівасці і пачуццёвага кахання Ярылы). Як адзначалі даследчыкі славянскай міфалогіі, "паганскія шлюбы і выкраданні жонак спалучаліся са святкаваннем Ярылы" [2, 7]. Такія ўступкі з боку ўвогуле строгіх нормаў звычаёвага права можна было лічыць праявай клопату абшчыны не толькі пра ўраджай, але і пра нараджэнне як мага большай колькасці дзяцей, працяг роду, калі сям'я па нейкіх прычынах не мела нашчадкаў. І сучасныя людзі працягваюць верыць у магічную сілу слова, гаючыя ўласцівасці родных крыніц і ўсемагутнасць кахання.

У беларускіх замовах мы не сустрэнем лёгкадумнага, неадказнага стаўлення да кахання, хутчэй падкрэсліваецца яго трагізм і наканаванасць лёсу. Верагодна, што замовы-прысушкі не толькі былі вядомыя знахарам, а і з'яўляліся часткай маладзёжнай культуры і спецыяльных абрадаў, уздзейнічалі на духоўны свет і сталенне асобы. У гэтым плане іх можна лічыць сродкам эстэтычнага і маральнага выхавання, "прышчэпкай" супраць цынічнага, негатыўнага ўспрымання ўзаемаадносінаў паміж мужчынам і жанчынай, іх празмернага фізіялагізму. Культурнаму чалавеку пераадолець такі негатывізм дапамагаюць мастацтва, найлепшыя народныя традыцыі і абрады. У старажытнай фальклорнай педагогіцы ў гэтай якасці выкарыстоўваліся замовы. Іх сакральны, містычны пачатак прымушае звярнуць увагу на найвышэйшую сутнасць і прыгажосць чалавечых пачуццяў, адчуць трапяткі страх перад неспазнаным. Замовы – гэта своеасаблівы ўрок маральнасці, "рэпетыцыя прызнання ў каханні". Яны тлумачылі прыроду кахання, яго асаблівасці, скіроўвалі на пошук свайго, адзінага спадарожніка жыцця. Звяртаючыся да знахараў, самастойна паўтараючы словы замовы, хлопцы і дзяўчаты атрымлівалі псіхалагічную дапамогу: узрастала вера ва ўласныя сілы, надзея на ўзаемнасць. Невыпадкова слова, думка атаясамліваліся з учынкам. Калі ж гэта была замова – слова магічнае, таемна нашаптанае, звернутае да найвышэйшых сілаў, то яно мела ўласцівасць у некалькі разоў павялічыць духоўны патэнцыял чалавека, дапамагала яму дасягнуць пастаўленай мэты, раскрыць унутраныя магчымасці сваёй душы. Формула кахання ўжо вынайдзена ў вуснай народнай творчасці кожнага асобнага народа і мае агульначалавечае значэнне. *"Очы ў очы, сэрца ў сэрца, мыслі ў мыслі"* [3, 370] – гучыць як маральны запавет да ўсіх закаханых.

## ЗАМОВЫ Ў СЯМ'І

У замовах-любжах створаны ўзор узаемаадносінаў паміж мужам і жонкай, ідэал сямейнай згоды. У народным разуменні гэта і матчына любоў, і любоў птушкі да роднага гнязда і сваіх птушанятаў, кароваў – да цяляткаў: *"Прыгорнемся адно к аднаму, як мацi к грудзям"* [3, 377], *"штоб ён міне так любіў і жалеў, як мацi малое дзіця"* [3, 379]. Так лірычна гучыць у беларускіх замовах прызнанне ў каханні, на такіх прынцыпах, паводле народнай маралі, павінна будавацца сям'я – аснова для нараджэння і правільнага выхавання дзяцей. Адначасова ў жанры замовы раскрываліся сутнасць і супярэчлівасць пачуцця, здольнага зрабіць так, *"штоб не было мілей яму ні род, ні племень, ні ацец, ні мацi"* [3, 375], але ўрэшце прыводзіла да стварэння новай сям'і, дзе ўзорам якраз і былі матчына любоў і ўзаемны клопат. Сімваламі сямейнага шчасця закаханых у замовах выступалі вобразы ключа і замка, схаваных "на дне мора, пад Латыр-каменем", недасягальных для чужых людзей. Адзінокі, несямейны чалавек асуджаўся народнай мараллю. Невыпадкова для таго, каб разладзіць вяселле, выкарыстоўваліся рытуальныя рэчы, у тым ліку тыя, што належалі ўдаўцу, удаве, бяздзетнай жанчыне. Такім чынам, у народнай міфалогіі прадметам, валасам надавалася магічнае значэнне: на іх пераносіліся маральныя якасці асобы. Прасочвалася сувязь не толькі паміж жывой і нежывой прыродай, што ўвогуле ўласціва магіі, але і паводзінамі, сямейным становішчам. Падкрэслівалася, што ад чалавека залежала і яго асабістае жыццё, і лёс блізкіх, аднавяскоўцаў. Калектыўная мараль асуджала пазашлюбных дзяцей, а таксама тых, хто двойчы ажаніўся, нават удоў і ўдаўцоў. Шэраг замоў скіраваны на захаванне сям'і: "Каб вярнуўся бацька да дзіцяці", "На ўмацаванне шлюбу". Вядомыя і замовы ад п'янства, якое нярэдка з'яўлялася прычынай нешчаслівага шлюбу.

Відавочна, што свой маральна-этычны ідэал народ выказаў у замовах. Часам мы ставімся да іх насмешліва, нават з пагардай, але ў крытычныя моманты жыцця, на мяжы паміж быццём і небыццём і дарослыя, сур'ёзныя людзі звяртаюцца да знахараў, выкарыстоўваюць народныя сродкі лячэння. Адназначнага адказу пра эфектыўнасць магічнага ўздзеяння няма і не можа быць, хоць выказваецца думка, што яно не саступае сучаснай псіхатэрапіі. Ды і зусім

натуральна, што, як і легендарны Антэй, людзі ўсіх нацый шукаюць паратунку ў травах і кветках роднай зямлі, у спрадвечных традыцыях, вераць у магічныя ўласцівасці роднай мовы, выхаваўчы патэнцыял якой не толькі не выкарыстоўваецца, але ў значнай ступені яшчэ і не спазнаны.

### Л і т а р а т у р а

1. **Шамякіна Т.** Раннія формы мастацтва // Роднае слова. 1996. № 9.

2. **Васілевіч У.** Беларуская міфалогія. – Мінск, 2001.

3. **Замовы** / Уклад., сіст. тэкстаў, уступ. арт. і камент. Г. Барташэвіч. – Мінск, 2000 (Беларуская народная творчасць).

4. **Барташэвіч Г.** Магічнае слова. – Мінск, 1990.

5. **Багдановіч А.** Перажыткі старажытнага светасузірання ў беларусаў. Рэпрынтнае выданне. – Мінск, 1995.

6. **Крук Я.** Сімволіка беларускай народнай культуры. – Мінск, 2001.

7. **Ракава Л.** Дзеці ў вераваннях і абрадах традыцыйнай культуры. Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы. – Мінск, 2000.

8. **Фрэзер Д.** Золотая ветвь: Исследование магии и религии. – Москва, 1986.

9. **Леви-Строс К.** Магия и религия // Структурная антропология. – Москва, 1985.